**23.** Выберыце з прапанаваных словы, у якіх ёсць [***дз’***].

*1) падзямелле; 2) падзарабіць; 3) падзвіжнік; 4) падзяўбці.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**24.** Дадзены словазлучэнні:

*1) варэнне з ягад; 2) чытаць уважліва; 3) надзвычай ярка; 4) твой выбар.*

Якое словазлучэнне абазначае дзеянне і яго прымету?

**А)** няма патрэбнага словазлучэння. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**25.** Якія прыклады з прапанаваных напісаны правільна?

*1) у даль мора; 2) з ранку да вечара; 3) кінуцца наўцёкі; 4) гаварыць паціху.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**26.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару ***г***?

*1) дайвін..; 2) боўлін..; 3) скейтбор..; 4) фларыс..*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**27.** Пры́сак – гэта … .

**А)** малады сасновы лес. **Б)** недаспелыя ягады. **В)** кавалак булкі.
**Г)** гарачы, распалены попел. **Д)** свіст, які суправаджае спевы.

---

**28.** Дадзены дзеясловы:

*1) частаваць; 2) шукаць; 3) зіхацець.*

Які(-ія) дзеяслоў(-ы) адносіцца(-яцца) да II спражэння?

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма патрэбнага дзеяслова. **В)** 1, 2. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**29.** Вызначце сказ, у якім правільна падкрэслены дзейнік.

*1. Вася адказаў на пытанне: “Над – <u>прыназоўнік</u>.”*
*2. <u>Займацца</u> спортам вельмі карысна ў любым узросце.*
*3. <u>Кожны</u> з іх добра ведаў правіла.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**30.** Хто з’яўляецца аўтарам вершаваных радкоў?

*Не шукай ты шчасця, долі*
*На чужым далёкім полі.*

**А)** Янка Купала. **Б)** Якуб Колас. **В)** Максім Багдановіч.
**Г)** Аркадзь Куляшоў. **Д)** Пятрусь Броўка.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
КОНКУРС

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 17. Тыраж 13550 экз. Мінск. 2024 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры
# «БУСЛІК-2024»

*Чацвер, 22 лютага 2024 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Выберыце словы, пры вымаўленні якіх на канцы чуецца [***т***].

*1) груд; 2) моладзь; 3) град; 4) медзь.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**2.** Якога дзеяслова не хапае ва ўстойлівым спалучэнні?

*… другую скрыпку.*

**А)** Шукаць. **Б)** Купляць. **В)** Іграць. **Г)** Аддаваць. **Д)** Майстраваць.

---

**3.** Лісцевае дрэва з белай карой і смачным веснавым сокам называецца … .

**А)** ясень. **Б)** бяроза. **В)** бук. **Г)** клён. **Д)** асіна.

---

**4.** Вызначце з прапанаваных прыкладаў толькі словазлучэнні.

*1) заўважылі непарадак; 2) грыбны суп;*
*3) прыляцеў самалёт; 4) з’явілася вясёлка.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**5.** У якіх лічэбніках колькасць гукаў і літар супадае?

*1) два; 2) тры; 3) чатыры; 4) сем.*

**А)** ва ўсіх лічэбніках. **Б)** у 1, 2. **В)** у 2, 3. **Г)** у 2, 4. **Д)** у 3, 4.

---

**6.** Дадзены сказ: *Ціха стаіць заснежаны лес.*

Колькі словазлучэнняў можна выпісаць?

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**7.** Выберыце з прапанаваных правільна напісаныя словы.

*1) праязднı; 2) бразгнуць; 3) капусны; 4) кантрасны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**8.** У якіх прыкладах з пераблытаных літар можна скласці назвы гульняў?

*1) э, і, н, т, с; 2) л, о, т, у, ф, б; 3) о, а, л, т.*

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма такіх прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**9.** Вызначце правільна напісаныя ў форме творнага склону назоўнікі.

*1) прыстанью; 2) прыгажосцью; 3) медаллю; 4) заваддзю.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма патрэбных назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**10.** Выберыце слова, у якім на месцы пропуску напішаце літару ***ы***.

*1) д..льфін; 2) др..вотня; 3) гард..роб.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбнага слова. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**11.** Якая расліна ў народзе называецца “агародным мясам”?

**А)** гарох. **Б)** фасоля. **В)** радыска. **Г)** бурак. **Д)** морква.

---

**12.** Вызначце лічэбнікі, у якіх на месцы пропуску неабходна напісаць мяккі знак (**ь**).

*1) восем..сот; 2) пяц..дзясят; 3) сем..дзясят; 4) шэсц..сот.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**13.** Які назоўнік прапушчаны ў народным выслоўі?

*Лес сякуць – … ляцяць.*

**А)** птушкі. **Б)** звяры. **В)** трэскі. **Г)** шышкі. **Д)** дуплы.

---

**14.** Суаднясіце прапанаваныя назоўнікі і іх значэнні.

*1) апад; 2) камель; 3) кафля.*

*а) ніжняя частка дрэва, якая прылягае да кораня;*

*б) плады, якія апалі ад ветру, у час навальніцы;*

*в) керамічны выраб для абліцоўкі сцен і печаў.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в. **Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

**15.** Дадзена народнае выслоўе:

*Ні па кані, ні па аглоблях.*

Якое значэнне яму адпавядае?

**А)** ‘унікаць у сутнасць якой-небудзь справы’.

**Б)** ‘прыблізна, без дапамогі вымяральных сродкаў’.

**В)** ‘прыцягваць увагу, быць асабліва прыметным’.

**Г)** ‘пра вельмі хуткае дзеянне’.

**Д)** ‘не так, як хацелася (зрабілася, атрымалася)’.

---

**16.** Выберыце з прапанаваных назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку.

*1) апілкі; 2) дэбаты; 3) падзеі.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма патрэбных назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**17.** Чым з’яўляюцца паміж сабой устойлівыя спалучэнні *душа ў душу* – *як кот з сабакам*?

**А)** сінонімамі. **Б)** амонімамі. **В)** антонімамі. **Г)** паронімамі. **Д)** амографамі.

---

**18.** Закончыце сказ: *Чалавек, які займаецца спортам, называецца … .*

**А)** спарсмен. **Б)** спартсмен. **В)** спарцмен. **Г)** спартысмен. **Д)** спарыцмен.

---

**19.** У народзе існуе шмат мудрых выразаў, якія застаўляюць падумаць, паразважаць. Але не заўсёды, што чуем, можам правільна запісаць. Вызначце правільна напісаны выраз.

**А)** Гавары, што ведаяш, але ведай, што гаворыш.

**Б)** Гавары, что ведаеш, але ведай, что гаварыш.

**В)** Гавары, што ведаешь, але ведай, што гаворышь.

**Г)** Гавары, што ведаеш, але ведай, што гаворыш.

**Д)** Гавары, што ведаеш, але ведай, што гаварыш.

---

**20.** Які займеннік напішаце на месцы пропуску ў народным выслоўі?

*Галава прыгожая не тым, што на ёй, а тым, што ў … .*

**А)** ей. **Б)** ёй. **В)** ней. **Г)** яе. **Д)** её.

---

**21.** Дапоўніце народны выраз:

*Адклад не ідзе ў … .*

**А)** адпачынак. **Б)** запас. **В)** лад. **Г)** будаўніцтва. **Д)** сяброўства.

---

**22.** Як называецца вадзяная кветка, па якой можна прадказаць змену надвор’я?

**А)** дзьмухавец. **Б)** гарлачык. **В)** дзядоўнік. **Г)** падбел. **Д)** чыстацел.